**Рэкамендацыі па выкарыстанні ў адукацыйным працэсе вучэбнага дапаможніка “Беларуская літаратура” для 9 класа**




Да 2019/2020 навучальнага года выдадзены новы вучэбны дапаможнік “Беларуская літаратура” (*В. У. Праскаловіч, В. П. Рагойша, Т. І. Шамякіна, Т. В. Кабржыцкая, М. В. Жуковіч / пад рэдакцыяй В. У. Праскаловіч, В. П. Рагойшы ): вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. – Мінск: НІА, 2019).*

Яго аўтары – доктар педагагічных навук прафесар кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры БДУ В. У. Праскаловіч; доктар філалагічных навук прафесар кафедры тэарэтычнага і славянскага літаратуразнаўства БДУ В. П. Рагойша; доктар філалагічных навук прафесар кафедры тэарэтычнага і славянскага літаратуразнаўства БДУ Т. І. Шамякіна; кандыдат філалагічных навук дацэнт Т. В. Кабржыцкая; дырэктар і настаўнік беларускай мовы і літаратуры кваліфікацыйнай катэгорыі “настаўнік-метадыст” дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 1 імя Х. В. Галаўко г. Бярозы”, выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь М. В. Жуковіч.

Курс 9-га класа ў сістэме адзінай непарыўнай літаратурнай адукацыі займае асобнае і адрознае (у параўнанні з папярэднімі класамі) месца як пераходны этап ад сярэдніх да старэйшых класаў і *адносна завяршае агульную сярэднюю адукацыю*.

У літаратурнай адукацыі 9-ы клас – клас “спецыяльна дыялагічны”, вучні якога арганізуюць паслядоўны дыялог паміж рознымі тыпамі культур (сярэдневяковай, рэнесансавай, Новага часу, ХХ стагоддзя). Навучанне ажыццяўляецца на аснове найбольш вядомых, рэпрэзентатыўных, “прэцэдэнтных” тэкстаў, засваенне якіх можа служыць ключом да разумення важных асаблівасцей культуры народа. Дыялог культур дазваляе падвесці вучняў да глыбейшага разумення заканамернасцей у развіцці мастацтва, замацаваць тэарэтычныя паняцці і дае магчымасць адчуць непаўторнасць індывідуальнасці кожнага мастака слова, самабытнасць і ўнікальнасць роднай літаратуры.

Практычная вартасць літаратурнага матэрыялу ў 9-м класе заключаецца ў тым, што з яго дапамогай фарміруецца сістэма духоўна-маральных і грамадзянскіх каштоўнасцей асобы, у яго скіраванасці на развіццё і рэалізацыю творчага патэнцыялу асобы. Уменні аналізаваць жыццёвыя сітуацыі, адлюстраваныя ў мастацкім творы, і лёсы герояў (учынак і яго светапоглядныя,

маральныя, псіхалагічныя матывіроўкі, маральны выбар і яго наступствы для асобы) вучань пераносіць на рэальныя сітуацыі і характары і такім чынам аказваецца падрыхтаваным да сустрэчы з нечаканымі абставінамі ў жыцці.

Канцэптуальная ідэя новага вучэбнага дапаможніка заключацца ў тым, што сучасны сродак навучання стане значным і цікавым для кожнага навучэнца, будзе пашыраць кантэкст успрыняцця літаратурнага твора, садзейнічаць фарміраванню трывалых маральна-этычных асноў, выхаванню грамадзянскасці, патрыятызму, адданасці нацыянальным і агульначалавечым ідэалам.

Прапанаваны аўтарамі змест вучэбнага дапаможніка не выходзіць за межы вызначанага вучэбнай праграмай мінімальнага і неабходнага для дасягнення адукацыйных мэт вучэбнага матэрыялу.

Для забеспячэння камп'ютарнай падтрымкі навучання беларускай літаратуры ў 9 класе асаблівае значэнне набывае электронны адукацыйны рэсурс "Беларуская літаратура. 9 клас", размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: http://e-vedy.adu.by (далей – ЭАР). Дадатковае выкарыстанне электроннага адукацыйнага рэсурсу паспрыяе значнаму пашырэнню адукацыйных магчымасцей новага вучэбнага дапаможніка.

**Структура вучэбнага дапаможніка ў цэлым і асобных раздзелаў**

Вучэбны дапаможнік уключае наступныя раздзелы:

метадычная прадмова (уступнае слова *"Ад аўтараў"*);

уводзіны;

тэматычныя раздзелы з наборам разнастайных тэкстаў[1];

выніковае абагульненне (*"ПАЎТАРЭННЕ І ПАДАГУЛЬНЕННЕ ВЫВУЧАНАГА ЗА ГОД*);

слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў;

бібліяграфія (літаратура, якая была выкарыстана пры падрыхтоўцы выдання).

Сістэма навігацыі, якая прадстаўлена знакамі-піктаграмамі, дазваляе хутка арыентавацца ў матэрыяле вучэбнага дапаможніка:

| | |
|---|---|
|  | успомніце раней вывучаны матэрыял ці паняцце |
|  | дадатковая інфармацыя |
|  | абмяркоўваем разам |
|  | прыкладныя тэмы для даследчых праектаў і творчых заданняў |
|  | спасылкі на ЭАР "Беларуская літаратура. IX клас", размешчаны на |

[1] У найноўшай інфармацыйна-адукацыйнай прасторы паняцце "тэкст" трактуецца ў шырокім сэнсе: гэта не толькі пісьмовы вербальны тэкст, але і рэпрадукцыя карціны, графічныя формы арганізацыі навучальнага матэрыялу і г. д.

| | |
|---|---|
| | нацыянальным адукацыйным партале http://e-vedy.adu.by |
| | спасылкі на заданні (QR-коды) для праверкі ведаў пры дапамозе смартфона ці планшэта. |

Унутры кожнага раздзела матэрыял размешчаны наступным чынам:

– загаловак раздзела:



# Рамантычнае і рэалістычнае адлюстраванне жыцця ў мастацкай літаратуры

Беларуская літаратура Новага часу (канец XVIII — пачатак XIX стагоддзя) мела даволі складаны характар. Тут сустракаліся самыя розныя тыпы творчасці — ад фальклорнага асветніцка-дыдактычнага да рамантычнага і рэалістычнага. Узнікшы ў вобліку калісьці ананімнай літаратуры («Тарас на Парнасе») і творчасці беларуска-польскіх літаратараў (Адам Міцкевіч, Ян Баршчэўскі), прыгожае пісьменства канчаткова сцвердзілася ў творчай практыцы Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Францішка Багушэвіча.

| Рамантычнае адлюстраванне жыцця | Рэалістычнае адлюстраванне жыцця |
|---|---|
| Характэрна асаблівая цікавасць да асобы, яе адносін да рэальнага жыцця, супрацьпастаўленне рэальнаму ідэальнага. | Характэрна праўдзівае ўзнаўленне жыцця, глыбокае раскрыццё чалавечых характараў, паказ іх абумоўленасці сацыяльнымі абставінамі. |
| Пісьменнік-рамантык не ставіць перад сабой мэты дакладна ўзнавіць жыццё. Рамантыку важней выказаць свае адносіны да свету, стварыць малюнак жыцця і праз яго данесці да чытача свой ідэал і сваё непрыманне свету. | Пісьменнік-рэаліст імкнецца да адлюстравання ў творы тыповага ў тыповых абставінах. Прадметам мастацкага даследавання становяцца абставіны і ўнутраны, псіхалагічна заглыблены свет чалавека. |

48

– вучэбны матэрыял (асноўныя, дадатковыя і тлумачальныя тэксты, ілюстрацыйныя матэрыялы):



Якуб Колас
(1882—1956)

◄ *У. Стальмашонак.*
Партрэт Якуба Коласа

1. Звярніце ўвагу на партрэт Якуба Коласа, выкананы мастаком Уладзімірам Стальмашонкам. Якім паўстае паэт на карціне? Якую функцыю выконвае дарога на карціне? Якія колеры пераважаюць на мастацкім палатне?
2. Чаму Якуб Колас абраў для сваёй творчасці менавіта такі псеўданім?

Сапраўднае імя Якуба Коласа — Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч. Ён нарадзіўся 3 лістапада 1882 года ў засценку Акінчыцы каля Стоўбцаў.

Бацькі — Міхал Казіміравіч і Ганна Юр'еўна — абое былі родам з Мікалаеўшчыны.

– метадычны апарат: пытанні і заданні праблемнага, эўрыстычнага і творчага характару, якія можна выкарыстаць для работы ў класе і дома:

1. Якая асноўная ідэя паэмы «Тарас на Парнасе»? Ці выяўляецца яна ў загалоўку твора?
2. Якую ролю ў асэнсаванні мастацка-ідэйнага зместу твора адыгрываюць вобразы Тараса, антычных багоў?
3. Якія тыповыя рысы народнага характару ўвасоблены ў вобразе Тараса? Што вас прываблівае ў гэтым вобразе? А што, магчыма, і адштурхоўвае? Адказ падмацуйце радкамі з тэксту.
4. У чым вы бачыце асаблівасць сюжэта і кампазіцыі паэмы?
5. Якое месца займае паэма «Тарас на Парнасе» ў гісторыі беларускай літаратуры?
6. Уявіце, што вы — шэф-повар сучаснага беларускага рэстарана «У Тараса». Складзіце меню для наведвальнікаў са страў, якія названы ў паэме «Тарас на Парнасе».
7. Падрыхтуйце калектыўную інсцэніроўку «Па дарозе на Парнас». Падбярыце для сцэнічнага прадстаўлення ўрывак з паэмы «Тарас на Парнасе». Прадумайце касцюмы, паводзіны, рэплікі герояў, дэкарацыі, музыку, шумавыя эфекты. Звярніце ўвагу на фотаздымак сцэны са спектакля «Тарас на Парнасе».
8. Прагледзьце відэаролікі да спектакля «Тарас на Парнасе». Ці захацелася вам наведаць гэту пастаноўку і чаму? Паспрабуйце распрацаваць эскізы афішы да спектакля.
9. Пазнайце героя па яго характарыстыцы ў творы (трэнажор «Героі паэмы "Тарас на Парнасе"»). Каму з герояў аўтар сімпатызуе, каго асуджае, высмейвае і чаму?

– праца з ЭАР “Беларуская літаратура. 9 клас”:

9. Прагледзьце тэлевізійны фільм «Песня пра зубра» (рэж. Эдуард Перагуд). Чым паэма М. Гусоўскага прывабіла аўтара сцэнарыя і рэжысёра-пастаноўшчыка фільма?
10. Пазнаёмцеся з ілюстрацыямі да паэмы Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра». Якія ўрыўкі з твора можна выкарыстаць для апісання гэтых малюнкаў? Якія паэтычныя радкі варта выкарыстаць для іх назвы?

Пры падрыхтоўцы метадычнага апарата новага вучэбнага дапаможніка была ўлічана работа вучняў на ўроку і прадугледжана іх самастойная праца дома пасля першага знаёмства з новым матэрыялам.

З прапанаваных *творчых заданняў* настаўнік выбірае тыя, выкарыстанне якіх ён лічыць найбольш дарэчным у пэўным класным калектыве, улічваючы індывідуальныя магчымасці вучняў, іх крэатыўныя здольнасці:

7. Ці супадае ў вашым уяўленні вобраз князя Вітаўта, прадстаўлены на ўроках літаратуры і гісторыі? Сінтэзуйце свае назіранні і падрыхтуйце адказ на пытанне «Чым уражвае асоба Вітаўта?». Даведайцеся, як ушаноўваецца памяць пра яго. Уявіце, што вам трэба прапанаваць макет помніка вялікаму князю. Якім ён вам бачыцца і чаму?

Асноўны вучэбны матэрыял выкладаецца ў 4-х раздзелах, у кожнага з іх – свае пазнавальныя, дыдактычныя, выхаваўчыя задачы.

У манаграфічных тэмах падаюцца звесткі аб жыцці і творчасці пісьменнікаў, дзеячаў культуры. Жыццёвая біяграфія майстра слова цесна звязана з акрэсленымі творамі і добра ілюструе спецыфіку часу, у якім ён жыў. Аднак асноўная ўвага вучняў канцэнтруецца на мастацкіх творах, чытанне якіх папярэджваецца і суправаджацца гісторыка-культурным каменціраваннем (з

падключэннем інфармацыі пра сувязі літаратурных твораў з эпохай, выяўленнем закладзеных у іх пазачасавых, вечных каштоўнасцей і іх сучаснага гучання).

Тэматычныя раздзелы адкрываюцца старонкай-навігатарам, у змесце якога захоўваюцца наступныя элементы:

1. назва раздзела (тэмы);
2. рубрыка **“Успомніце”** ў пачатку раздзела змешчана перад кароткімі звесткамі аб жыцці і творчасці пісьменнікаў (н-д, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Уладзіміра Караткевіча), з творчасцю якіх вучні ўжо знаёміліся ў папярэдніх класах. Рубрыка “Успомніце” паслужыць своеасаблівым “мастком” паміж ужо засвоеным (пройдзеным) і новым вучэбным матэрыялам:



Ефрасіння Полацкая

(≈1105? — 1173?)[1]

◀ *В. Варэца і Л. Варэца.* Ефрасіння Полацкая

З якімі фактамі жыцця Е. Полацкай вы пазнаёміліся ў папярэдніх класах? Якой яна паўстае з твора Сяргея Тарасава «Ефрасіння Полацкая»? Што вы ведаеце з урокаў гісторыі пра Полацкае княства і яго ролю ў гісторыі ўсходніх славян?

Ад чаго паходзіць назва горада Полацк?

Полацк — калыска беларускай культуры. Чым больш грунтоўна даследчыкі-археолагі вывучаюць горад, тым далей у глыбіню стагоддзяў адносяць яго пачатак. З глыбокай старажытнасці тут жыло племя палачан, якое ўваходзіла ў вялікі ўсходнеславянскі племянны саюз **крывічоў**, што значыць «родных па крыві». У апошні час высветлілася, што каля Полацка размяшчаецца і геаграфічны цэнтр Еўропы.

Ці ведаеце вы, ад чаго паходзяць назвы населеных пунктаў, у якіх вы жывяце?

◀ *А. Прохараў.* Памятны знак «Геаграфічны цэнтр Еўропы» ў Полацку

[1] Гады жыцця Ефрасінні Полацкай дакладна не вядомыя. Сёння прапануюцца наступныя даты: ≈1105? — 1173? гады.

10

У асноўным тэксце прысутнічае інфармацыя пра эпоху, адметнасці часу, звесткі з жыцця і творчасці пісьменнікаў, а таксама дадатковая інфармацыя ў рубрыцы **“Цікава ведаць”**. Падача на плашках цікавага фактычнага і павучальнага зместу міні-тэкстаў пад рубрыкай “Цікава ведаць” звязаны з рэкламай энцыклапедычных выданняў, з пералікам сайтаў, якія прысвечаны жыццю і творчасці пісьменнікаў і інш.

У змесце новага вучэбнага дапаможніка паслядоўна рэалізуюцца міжпрадметныя сувязі з такімі вучэбнымі прадметамі, як “Гісторыя Беларусі”, “Беларуская мова”, “Руская літаратура”, “Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)”. Да біяграфіі майстроў слова і іх твораў змяшчаюцца рэпрадукцыі карцін беларускіх і сусветных мастакоў, фотаздымкі і інш. Фрагменты кіно, тэатра, музейных экспазіцый і інш. будуць прадстаўлены ў электронным рэсурсе са спасылкай у вучэбным дапаможніку. Упершыню змест вучэбнага дапаможніка па літаратуры будзе прадстаўлены элементамі так званай *“дабаўленай рэальнасці”*, якія імітуюць пэўныя працэсы і сітуацыі.

Вырашэнню задачы якаснага засваення ведаў спрыяе і спецыяльнае пазначэнне літаратуразнаўчых тэрмінаў, паняццяў (найбольш важныя – пазначаны **тлустым шрыфтам**, менш значныя – *курсівам*). Пры гэтым ключавыя паняцці з азначэннямі прадубліраваны ў ***“Слоўніку літаратуразнаўчых тэрмінаў”*** (размешчаны ў канцы вучэбнага дапаможніка). Даты гісторыка-літаратурных падзей, якія з’яўляюцца абавязковымі для запамінання, таксама абазначаны пры іх першым згадванні тлустым шрыфтам.

Галоўным у арганізацыі структуры і зместу вучэбнага дапаможніка новага пакалення з’яўляецца не толькі яго зместавае напаўненне, а тая праца, якая можа быць з гэтым тэкстам арганізавана. Вучэбная кніга будзе выконваць функцыі забеспячэння такой арганізацыі зместу, якая дапаможа настаўніку мэтанакіравана планаваць пэўныя вучэбныя дзеянні.

Асаблівасцю новага вучэбнага дапаможніка з’яўляецца больш выразны акцэнт на фарміраванні асобасных, метапрадметных і прадметных кампетэнцый навучэнцаў. Кампетэнтнасны падыход у навучанні беларускай літаратуры прадугледжвае накірунак не на механічнае запамінанне пэўнага аб’ёму літаратуразнаўчай інфармацыі, а на фарміраванне ў навучэнцаў досведу самастойнага вырашэння задач, звязаных з практычным прымяненнем ведаў культуралагічнага і гісторыка-літаратурнага зместу з апорай на сацыяльны вопыт. Развіццё прадметных кампетэнцый адбываецца за кошт удакладнення і пашырэння відаў вучэбнай дзейнасці, якія рэалізуюць практыкаарыентаваны характар літаратурнай адукацыі. У метадычным апараце вучэбнага дапаможніка такі змест работы знойдзе адлюстраванне ў **кампетэнтнасна-арыентаваных заданнях**.

*Прыклад кампетэнтнасна-арыентаванага задання*

9. Складзіце спіс (меню) страў старажытнай беларускай кухні з апісаных у аповесці «Дзікае паляванне караля Стаха». Раскажыце пра стравы, якія гатуюцца ў вашай сям’і на святы. Ці ёсць сярод іх узгаданыя У. Караткевічам?

Па спасылцы на інтэрактыўныя заданні, зашыфраванай у QR-код, вучні могуць праверыць свае веды з дапамогай смартфона ці планшэта. Для гэтага неабходна спампаваць і ўсталяваць на смартфон ці планшэт мабільны дадатак –

сканер QR-кода. Пры навядзенні аб’ектыва камеры на выяву QR-кода аўтаматычна адбываецца і яго распазнанне. Інфармацыя, зашыфраваная ў QR-кодзе, з’явіцца на экране смартфона ці планшэта.

*Прыклад інтэрактыўнага задання*

11. Пазнайце героя па яго маўленчым партрэце (трэнажор «Героі камедыі В. Дуніна-Марцінкевіча "Пінская шляхта"»).

Але неабходна памятаць, што **інтэрактыўныя заданні не з’яўляюцца абвязковымі для ўсіх вучняў.**

Настаўнік мае права з улікам асаблівасцей арганізацыі адукацыйнага працэсу ва ўстанове адукацыі, навучальна-выхаваўчай дзейнасці і пазнавальных магчымасцей вучняў змяніць колькасць вучэбных гадзін і паслядоўнасць вывучэння матэрыялу ў межах вучэбнага часу, прызначанага для абавязковага засваення. Варта ўлічыць, што рэзервовы час можа быць выкарыстаны па сваім меркаванні на чытанне і асэнсаванне літаратурных твораў.

Электронная форма вучэбнага дапаможніка ўяўляе сабой вучэбны дапаможнік у фармаце *pdf, які можа быць выкарыстаны з дапамогай камп’ютара, планшэта, інтэрактыўнай дошкі і інш. Прынцыповым адрозненнем электроннай версіі вучэбнага дапаможніка з’яўляецца яго інтэрактыўнасць – наяўнасць актыўных зон (гіперспасылак), якія даюць магчымасць вучню перайсці да дадатковага матэрыялу і пасля знаёмства з ім вярнуцца да зыходнага вучэбнага тэксту. Спампаваць электронную форму вучэбнага дапаможніка можна па спасылцы http://e-padruchnik.adu.by/.